Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-04-05

# «Палымянскія» далягляды

Нацыянальная бібліятэка Беларусі стала месцам правядзення «круглага стала», прысвечанага выхаду тысячнага нумара часопіса «Полымя».

Даніла АРЦІМОВІЧ

Дыскусію адкрыў паэт, галоўны рэдактар выдання Мікола Мятліцкі. Ён згадаў прозвішчы як славутых айчынных пісьменнікаў, так і сучаснікаў, чые творы ўпершыню з'явіліся на старонках «Полымя», падзяліўся планамі ды падкрэсліў вернасць курсу, якога часопіс прытрымліваецца апошнія дзесяць гадоў.

Літаратуразнаўца, акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў зрабіў сціслы экскурс у гісторыю выдання і нават прапанаваў правесці спецыяльны пленум Праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны юбілею. А таксама пакрытыкаваў сучасных празаікаў, якія ператварыліся ў кабінетных творцаў, абыякавых да сучасных праблем.

На думку акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандра Кавалені, на старонках «Полымя» часам адчуваецца недахоп матэрыялаў крытычнага характару. Акрамя таго, прамоўца хацеў бы бачыць у часопісе і разважанні, адлюстраванне сённяшніх праблем, сацыяльных, палітычных. Краязнаўца Анатоль Статкевіч-Чабаганаў працягнуў гэтую думку і звярнуў увагу прысутных на праблему знікнення вёсак. Нездарма разам з імі сыходзяць у нябыт іх культура, фальклор. Творца расказаў пра сваю родную вёску на Любаншчыне, заснаваную ўсяго 120 гадоў таму. Раней там штогод праводзіліся кірмашы, а цяпер жывуць усяго чатыры чалавекі. Каб не згінула памяць і гісторыя, А.Статкевіч-Чабаганаў даследаваў гісторыю вёскі, напісаў кнігу і зрабіў фотагалерэю яе жыхароў, пра якіх удалося знайсці звесткі.

Таксама ў «круглым стале» ўзялі ўдзел намеснік дырэктара НББ Алесь Суша, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў Даніловіч, літаратуразнаўцы Сяргей Гаранін і Валерый Максімовіч, паэт, празаік, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда», галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Алесь Бадак, публіцыст Зіновій Прыгодзіч, паэт Алесь Бараноўскі і супрацоўнікі «Полымя» Уладзімір Мазго, Алесь Марціновіч і Вадзім Спрынчан.